Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне
па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

# БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ
## Раздзел 1. АРГАНІЗАЦЫЯ І ТЭХНАЛОГІЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РАБОТЫ

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*
*(па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2017

**СКЛАДАЛЬНІК**
*С. В. Зыгмантовіч,* загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*вучоны* савет дзяржаўнай установы «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»;
*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання фондаў дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 23.05.2016 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 19.10.2016 г.);
*навукова-метадычным* саветам па культуры, бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 21.10.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: С. В. Зыгмантовіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Вучэбная дысцыпліна «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне» складаецца з двух раздзелаў: «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» і «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк». Дадзеная праграма прызначана для вывучэння першага раздзела «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы».

Вучэбная дысцыпліна «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 1. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» забяспечвае падрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў у сферы бібліяграфічнай дзейнасці, садзейнічае развіццю прафесійных кампетэнцый, фарміруе веды і ўменні, неабходныя для выканання ўсіх працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці ў новых інфармацыйна-тэхналагічных умовах работы бібліятэк.

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны абумоўлена як фундаментальнай роллю спецыяльных бібліяграфічных ведаў у фарміраванні прафесійнага светапогляду студэнтаў, так і неабходнасцю набыцця канкрэтных прафесійных уменняў і навыкаў у арганізацыі і ажыццяўленні разнастайных кірункаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 1. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» з’яўляецца фарміраванне прафесійных кампетэнцый, звязаных з падрыхтоўкай, выкарыстаннем і распаўсюджваннем разнастайных відаў бібліяграфічных рэсурсаў, прадуктаў і паслуг з мэтай задавальнення патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэк у інфармацыі і ведах.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны абумоўлівае неабходнасць вырашэння наступных *задач:*

– раскрыць арганізацыйныя асаблівасці ажыццяўлення бібліяграфічнай дзейнасці рознымі суб’ектамі сістэмы дакументных камунікацый, напрамкі іх узаемадзеяння на другасна-дакументным узроўні;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– паказаць асаблівасці арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках розных тыпаў;

– разгледзець склад, асаблівасці фарміравання і выкарыстання даведачна-бібліяграфічнага апарату як асноўнай базы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк;

– раскрыць арганізацыйныя і тэхналага-метадычныя асаблівасці выканання розных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

− асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці краіны, кірункі іх узаемадзеяння;

− асаблівасці арганізацыйна-функцыянальнай структуры бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў;

– рэсурсы і тэхналогію асноўных відаў бібліяграфічнай дзейнасці;

*умець:*

− камплектаваць, арганізоўваць і выкарыстоўваць розныя часткі даведачна-бібліяграфічнага апарату;

− вывучаць патрэбнасці ў бібліяграфічнай інфармацыі карыстальнікаў;

− ствараць і выкарыстоўваць розныя бібліяграфічныя рэсурсы, прадукты і паслугі;

*валодаць:*

− навыкамі бібліяграфавання, бібліяграфічнага пошуку, вывучэння і задавальнення патрэбнасцей карыстальнікаў у інфармацыі і бібліяграфічных паслугах;

− сучаснымі формамі, метадамі, аўтаматызаванымі і традыцыйнымі тэхналогіямі бібліяграфічнага абслугоўвання розных катэгорый карыстальнікаў.

Засваенне тыпавой вучэбнай праграмы «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 1. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» па спецыльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый.

*Акадэмічныя кампетэнцыі:*

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:*

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

*Прафесійныя кампетэнцыі:*

Вытворча-тэхналагічная дзейнасць

ПК-4. Весці інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў розных сфер дзейнасці.

ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў.

Сацыякультурная дзейнасць

ПК-8. Устанаўліваць і падтрымліваць трывалыя сувязі з рознымі сацыяльнымі інстытутамі з мэтай фарміравання спрыяльнага сацыякультурнага асяроддзя; развіваць сацыяльнае партнёрства з мясцовымі ўладамі і грамадскасцю.

ПК-9. Арганізоўваць і праводзіць інфармацыйна-асветніцкія, адукацыйныя, культурна-творчыя, культурна-дасугавыя і рэкрэацыйна-аздараўленчыя мерапрыемствы.

Інавацыйна-метадычная дзейнасць

ПК-12. Вывучаць, аналізаваць і ўкараняць сусветны вопыт інавацыйнай дзейнасці бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў.

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-14. Распрацоўваць метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, арганізацыйна-тэхналагічную дакументацыю.

Арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць

ПК-37. Арганізоўваць і суправаджаць павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк.

Для паспяховага вывучэння студэнтамі вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 1. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» неабходна засваенне шэрагу іншых спецыяльных дысцыплін. Выкладанне вучэбнай дысцыпліны базіруецца ў першую чаргу на ведах, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні вучэбных дысцыплін «Тэорыя інфармацыі і дакументалогія», «Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя», «Бібліятэказнаўства. Раздзел 1. Тэорыя», «Інфармацыйныя рэсурсы. Каталагізацыя дакументаў». У сваю чаргу веды, уменні і навыкі, атрыманыя пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 1. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы», з’яўляюцца асновай для засваення іншых дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага цыкла: галіновых бібліяграфіч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных дысцыплін, «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 2. Абслугоўванне карыстальнікаў», «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент», дысцыплін, звязаных з падрыхтоўкай бібліяграфічных прадуктаў і паслуг і задавальненнем патрэбнасцей карыстальнікаў у бібліяграфічнай інфармацыі.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць удзелу студэнтаў у пошуку і кіраванні ведамі, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; праектныя тэхналогіі; камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, круглыя сталы, канферэнцыі і інш.); метад аналізу вытворчых сітуацый; гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў бібліятэчнай сферы мэтазгодна ў практыцы правядзення заняткаў выкарыстоўваць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам і адукацыйным стандартам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне» ўсяго прадугледжана 380 гадзін, з якіх 210 гадзін – аўдыторныя заняткі. На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 1. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» ўсяго прадугледжана 158 гадзін, з іх 90 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 34 гадзіны, семінарскія заняткі – 8 гадзін, лабараторныя заняткі – 36 гадзін, практычныя заняткі – 12 гадзін. Рэкамендаваныя формы кантролю – залік і экзамен. Паспяховаму засваенню вучэбнай дысцыпліны спрыяе ўключэнне заданняў у праграму вытворчай практыкі. Атрыманыя ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны веды, навыкі і ўменні з’яўляюцца базавымі і падлягаюць кантролю на дзяржаўным экзамене.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лек. | сем. | лаб. | практ. |
| Уводзіны | 1 | 1 | | | |
| **Раздзел I. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь** | | | | | |
| *Тэма 1.* Бібліяграфічная дзейнасць: змест і асаблівасці ў сучасных інфармацыйна-тэхналагічных умовах | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 2.* Асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь і іх узаемадзеянне | 2 | 2 | | | |
| **Раздзел II. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы** | | | | | |
| *Тэма 3.* Арганізацыйна-функцыянальная структура бібліяграфічнай службы ў бібліятэках розных тыпаў | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 4.* Бібліяграфічныя функцыі бібліяграфічных і небібліяграфічных падраздзяленняў бібліятэкі | 2 | | 2 | | |
| **Раздзел III. Даведачна-бібліяграфічны апарат (ДБА) бібліятэкі** | | | | | |
| *Тэма 5.* Даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі: агульная характарыстыка | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 6.* Сістэма каталогаў і картатэк (баз даных) бібліятэкі | 6 | 2 | | 4 | |
| *Тэма 7.* Даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі | 8 | 4 | | | 4 |
| *Тэма 8.* Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў | 1 | 1 | | | |
| *Тэма 9.* Сеткавыя электронныя рэсурсы ў структуры ДБА бібліятэкі | 5 | 1 | | 4 | |
| **Раздзел IV. Арганізацыя і тэхналогія вытворчасці бібліяграфічнай прадукцыі** | | | | | |
| *Тэма 10.* Арганізацыя, тэхналогія і методыка падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў | 12 | 2 | | 6 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 11.* Тэхналогія падрыхтоўкі бібліяграфічных і фактаграфічных баз даных | 4 | 2 | | 2 | |
| **Раздзел V. Спажыўцы бібліяграфічнай інфармацыі і метады вывучэння іх інфармацыйных патрэбнасцей** | | | | | |
| *Тэма 12.* Паняцце і сутнасць інфармацыйных патрэбнасцей | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 13.* Метады вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей | 2 | | 2 | | |
| **Раздзел VI. Арганізацыя, тэхналогія і методыка бібліяграфічнага абслугоўвання** | | | | | |
| *Тэма 14.* Задачы і змест бібліяграфічнага абслугоўвання | 4 | 2 | 2 | | |
| *Тэма 15.* Бібліяграфічнае інфармаванне: арганізацыя і тэхналогія | 8 | 2 | | 4 | 2 |
| *Тэма 16.* Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне: арганізацыя і тэхналогія | 8 | 2 | | 6 | |
| **Раздзел VII. Фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі** | | | | | |
| *Тэма 17.* Фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі: агульныя пытанні | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 18.* Формы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі | 6 | | | 6 | |
| **Раздзел VIII. Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі** | | | | | |
| *Тэма 19.* Агульныя пытанні кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 20.* Планаванне, улік і справаздача аб бібліяграфічнай рабоце | 4 | 2 | | 2 | |
| *Тэма 21.* Метадычнае забеспячэнне бібліяграфічнай дзейнасці | 4 | | | 2 | 2 |
| **Разам…** | **90** | **34** | **8** | **36** | **12** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне. Раздзел 1. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы». Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Практычная накіраванасць вучэбнай дысцыпліны. Веды, навыкі і ўменні, прафесійныя кампетэнцыі, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны. Яе ўзаемасувязі з іншымі спецыяльнымі прадметамі інфармацыйна-дакументнага цыкла. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Формы кантролю. Характарыстыка забяспечанасці вучэбнай дысцыпліны вучэбна-метадычнай літаратурай.

## Раздзел І. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

### *Тэма 1. Бібліяграфічная дзейнасць: змест і асаблівасці ў сучасных інфармацыйна-тэхналагічных умовах*

Бібліяграфічная дзейнасць: азначэнне і яе асноўныя напрамкі. Арганізацыя, тэхналогія і методыка бібліяграфічнай дзейнасці: азначэнне паняццяў і іх суадносіны. Характарыстыка асноўных тэхналагічных працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці. Бібліяграфічныя прадукты і паслугі як канчатковы вынік бібліяграфічнай вытворчасці. Асаблівасці бібліяграфічнай дзейнасці на сучасным этапе, яе значэнне для развіцця розных сацыяльных, навуковых, вытворчых сфер грамадства.

### *Тэма 2. Асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь і іх узаемадзеянне*

Арганізацыйна-ведамасная раздробленасць як асаблівая рыса арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці. Арганізацыйная структура бібліяграфічнай дзейнасці, прынцыпы яе арганізацыі: ведамасны, змястоўны, тэрытарыяльны. Асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Нацыянальная кніжная палата Беларусі як нацыянальны бібліяграфічны цэнтр, яе задачы, функцыі, кірункі дзейнасці, сістэма бібліяграфічных выданняў і электронных рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэкі ў сістэме бібліяграфічнай дзейнасці краіны, асаблівасці іх функцыянавання як бібліяграфічных цэнтраў, дыферэнцыяцыя іх функцый у залежнасці ад ведамаснай, змястоўнай і тэрытарыяльнай прыналежнасці. Органы навукова-тэхнічнай інфармацыі, асаблівасці дзейнасці выдавецтваў, кнігагандлёвых прадпрыемстваў, архіваў, музеяў, сродкаў масавай інфармацыі як суб’ектаў бібліяграфічнай дзейнасці. Узаемадзеянне бібліяграфічных цэнтраў – аб’ектыўная неабходнасць на шляху фарміравання адзінай інфармацыйнай сістэмы краіны. Узаемадзеянне бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў. Асноўныя ўмовы і напрамкі ўзаемадзеяння бібліятэк. Роля Рэспубліканскага бібліятэчнага савета, Савета па інфармацыйным узаемадзеянні бібліятэк, ББА ў арганізацыі ўзаемадзеяння. Характарыстыка асноўных рэспубліканскіх, ведамасных праектаў бібліятэк па сумесным вядзенні БД, бібліяграфічным абслугоўванні, падпісцы і забеспячэнні доступу да БД і інш.

## Раздзел II. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы

### *Тэма 3. Арганізацыйна-функцыянальная структура бібліяграфічнай службы ў бібліятэках розных тыпаў*

Уяўленне аб бібліяграфічнай службе бібліятэкі. Задачы, якія стаяць перад бібліяграфічнымі службамі бібліятэк у сучасных умовах. Прынцыпы і сучасныя патрабаванні да арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках. Залежнасць яе арганізацыйна-функцыянальнай структуры ад задач бібліятэкі, яе тыпу, месца ў сістэме бібліятэк рэгіёна (галіны), спецыялізацыі дзейнасці і зместу бібліяграфічных працэсаў.

Асаблівасці структуры бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў краіны. Паняцце аб цэнтралізаваным і дэцэнтралізаваным характары бібліяграфічнай службы бібліятэкі. Арганізацыйна-функцыянальная структура бібліяграфічнай службы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ), абласных універсальных навуковых бібліятэк (АУНБ), цэнтралізаваных сістэм публічных бібліятэк. Бібліяграфічная служба ў спецыяльных навуковых і навукова-тэхнічных бібліятэках. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках, якія не маюць бібліяграфічных падраздзяленняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Бібліяграфічныя функцыі бібліяграфічных і небібліяграфічных падраздзяленняў бібліятэкі*

Бібліяграфічны аддзел – галоўнае звяно бібліяграфічнай службы бібліятэкі. Яго задачы, структура і функцыі ў бібліятэках розных тыпаў. Бібліяграфічныя працэсы як «скразная» функцыя бібліятэкі. Выкананне бібліяграфічных працэсаў небібліяграфічнымі падраздзяленнямі: функцыянальнымі аддзеламі (камплектавання, апрацоўкі дакументаў і каталогаў, абслугоўвання і інш.); галіновымі, комплекснымі.

## Раздзел III. Даведачна-бібліяграфічны апарат (ДБА) бібліятэкі

*Тэма 5. Даведачна-бібліяграфічны апарат: агульная характарыстыка*

ДБА бібліятэкі: азначэнне паняцця, функцыянальнае прызначэнне, структура. Формы існавання розных частак ДБА. Уплыў выкарыстання аўтаматызаваных тэхналогій на структуру і формы існавання розных частак ДБА. Залежнасць якасці ДБА ад яго асноўных уласцівасцей: сістэмнасці, пластычнасці, надзейнасці, даступнасці і эканамічнасці. Адзінства прынцыпаў і метадычных рашэнняў у фарміраванні ўсіх частак ДБА. Фактары, якія ўплываюць на склад і аб’ём ДБА. Асаблівасці ДБА бібліятэк розных тыпаў. Карпаратыўная работа бібліятэк па фарміраванні ДБА. Значэнне ДБА для работы бібліятэк. Задачы бібліятэк па развіцці ДБА.

*Тэма 6. Сістэма каталогаў і картатэк (баз даных) бібліятэкі*

Азначэнне каталога і картатэкі, іх адрозніванне. Фактары, якія ўплываюць на вызначэнне неабходнага набору каталогаў і картатэк. Паняцце «самастойны каталог/картатэка» як адзін з крытэрыяў пры вызначэнні складу каталогаў і картатэк бібліятэкі.

Асноўныя віды картатэк, якія вядуцца ў бібліятэках. Сістэматычная картатэка артыкулаў (СКА), яе прызначэнне і методыка складання. Тэматычныя, спецыяльныя і фактаграфічныя картатэкі ў бібліятэках розных тыпаў, асаблівасці іх вядзення ў традыцыйнай форме.

Трансфармацыя картатэк у бібліяграфічныя, фактаграфічныя базы даных як сучасная тэндэнцыя развіцця гэтай часткі ДБА.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівасці вядзення бібліяграфічнай БД «Артыкулы»: лінгвістычныя, праграмныя, тэхнічныя сродкі. Тэхналогія вядзення БД «Артыкулы»: увод бібліяграфічнай інфармацыі, фарміраванне слоўнікаў, магчымасці пошуку інфармацыі. Характарыстыка фактаграфічных БД, генерыруемых бібліятэкамі краіны.

*Тэма 7. Даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі*

Даведачна-бібліяграфічны фонд (ДБФ) бібліятэкі: азначэнне, функцыянальнае прызначэнне, прынцыпы і крыніцы камплектавання. Склад ДБФ. Суадносіны ДБФ і агульнага фонду бібліятэкі. Актыўная і пасіўная часткі ДБФ. Падыходы і праблемы камплектавання ДБФ дакументамі на розных носьбітах. Асаблівасці арганізацыі ДБФ у бібліятэках.

Афіцыйныя выданні і матэрыялы, паўнатэкставыя БД прававой інфармацыі ў складзе ДБФ, іх прызначэнне, пошукавыя магчымасці, напрамкі выкарыстання ў дзейнасці бібліятэк. Сайты прававой інфармацыі ў Інтэрнэце. Даведачныя выданні ў складзе ДБФ: іх відавая характарыстыка. Электронныя даведачныя выданні, іх характарыстыка. Асаблівасці камплектавання даведачных выданняў у ДБФ бібліятэк розных тыпаў і забеспячэнне доступу да электронных даведачных рэсурсаў. Напрамкі іх выкарыстання.

Бібліяграфічныя выданні, неапублікаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі, бібліяграфічныя БД у ДБФ бібліятэкі. Прадастаўленне доступу да бібліяграфічных баз даных праз віртуальныя сэрвісы («віртуальная чытальная зала»). Асаблівасці камплектавання, прадастаўлення доступу і выкарыстання ў бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці.

Крыніцы агульнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі, іх асаблівасці і функцыянальнае прызначэнне. Характарыстыка крыніц бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі; агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі; масавай бібліяграфічнай інфармацыі. Напрамкі іх выкарыстання ў рабоце бібліятэк.

Крыніцы спецыяльнай бібліяграфіі ў ДБФ: асноўныя віды. Крыніцы навукова-дапаможнай бібліяграфіі, іх відавая класіфікацыя, арганізацыйныя і метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі, функцыянальнае прызначэнне. Характарыстыка навукова-дапаможных бібліяграфічных выданняў і баз даных, генерыруемых і набываемых бібліятэкамі краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Крыніцы папулярнай (рэкамендацыйнай) бібліяграфіі ў ДБФ: асноўныя тыпы і жанры, іх характарыстыка, функцыянальнае прызначэнне. Бюлетэнь «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”, яго змястоўна-функцыянальны аналіз, напрамкі выкарыстанння.

*Тэма 8. Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў*

Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў (ФНБД) як частка ДБА. Прызначэнне, асаблівасці яго камплектавання, крытэрыі адбору бібліяграфічных крыніц у ФНБД. Формы арганізацыі ФНБД у бібліятэках. Архіў выкананых даведак у структуры сэрвісу віртуальнай службы «Запытай бібліёграфа». Выкарыстанне інтэрнэт-тэхналогій для інфармавання аб ФНБД. Кірункі выкарыстання матэрыялаў фонду ў рабоце бібліятэк.

*Тэма 9. Сеткавыя электронныя рэсурсы ў структуры ДБА бібліятэкі*

Значэнне сеткавых інфармацыйных рэсурсаў для работы бібліятэкі і іх прадастаўленне праз ДБА бібліятэкі. Сродкі забеспячэння доступу да інтэрнэт-рэсурсаў як кампанентаў ДБА бібліятэкі. Віды інтэрнэт-рэсурсаў як аб’ектаў бібліяграфавання для навігатара, генерыруемага бібліятэкай.

Тэхналогія падрыхтоўкі навігатараў па інтэрнэт-рэсурсах як састаўной часткі ДБА: прынцыпы адбору рэсурсаў; характарыстыка рэсурсу; групоўка матэрыялу; выкарыстанне тэхналогіі гіперспасылак; актуалізацыя матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел IV. Арганізацыя і тэхналогія вытворчасці бібліяграфічнай прадукцыі

*Тэма 10. Арганізацыя, тэхналогія і методыка падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў*

Бібліяграфаванне дакументаў на розных участках бібліятэчнай работы. Асноўныя этапы складання бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў, тыпаў, жанраў, форм. Характарыстыка тэхналагічных працэсаў падрыхтоўчага этапу: выбар тэмы дапаможніка і яе вывучэнне; складанне плана-праспекта дапаможніка; выяўленне дакументаў.

Характарыстыка тэхналагічных працэсаў аналітычнага этапу: агульны бібліяграфічны аналіз дакумента; бібліяграфічнае апісанне; анатаванне і рэферыраванне; індэксаванне і прадметызацыя; складанне бібліяграфічных запісаў. Характарыстыка тэхналагічных працэсаў сінтэтычнага этапу: канчатковы адбор дакументаў, яго віды і крытэрыі адбору; групоўка бібліяграфічных запісаў, мэты, асноўныя спосабы, метадычныя патрабаванні.

Характарыстыка тэхналагічных працэсаў заключнага этапу: падрыхтоўка даведачна-метадычнага апарату бібліяграфічнага дапаможніка (прадмовы, уступнага артыкула, дапаможных паказальнікаў); навуковае, літаратурнае і бібліяграфічнае рэдагаванне дапаможніка; афармляльныя аперацыі перад здачай дапаможніка ў друк. Асаблівасці падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў і жанраў.

*Тэма 11. Тэхналогія падрыхтоўкі бібліяграфічных і фактаграфічных баз даных*

Тэхналогія фарміравання баз даных (БД). Тэхналагічнае праектаванне шляхам распрацоўкі тэхнічнага задання на стварэнне БД, яго змест. Адбор дакументаў для стварэння БД: вызначэнне кола крыніц для выяўлення дакументаў (лакальных і знешніх бібліяграфічных БД; крыніц, даступных праз тэлекамунікацыйныя сродкі сувязі). Фарміраванне пошукавага прадпісання. Правядзенне бібліяграфічнага пошуку. Адбор дакументаў. Падрыхтоўка бібліяграфічных запісаў на дакументы. Увод інфармацыі ў БД у адпаведнасці з фарматам бібліяграфічных запісаў. Кантроль машыначытаемага БЗ. Актуалізацыя БД: увод новых, выключэнне і змяненне запісаў. Дакументацыйнае забеспячэнне генерыруемых БД і іх рэгістрацыя. Пошукавыя магчымасці бібліяграфічных БД.

Падрыхтоўка фактаграфічных БД. Асаблівасці выяўлення фактаграфічнай інфармацыі па крыніцах пошуку, фарміравання фармату фактаграфічнага апісання. Спецыяльныя макеты фарматаў для БД, якія адлюстроўваюць хроніку падзей, адрасныя БД, персанальныя БД. Пошукавыя магчымасці фактаграфічных БД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел V. Спажыўцы бібліяграфічнай інфармацыі і метады вывучэння іх інфармацыйных патрэбнасцей

### *Тэма 12. Паняцце і сутнасць інфармацыйных патрэбнасцей*

Задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей (ІП) карыстальнікаў – галоўная мэта бібліяграфічнага абслугоўвання. Азначэнне ІП. Механізм іх фарміравання і задавальнення. Суадносіны ІП з інфармацыйнымі інтарэсамі і інфармацыйнымі запытамі. Прычыны ўзнікнення патрэбнасцей у бібліяграфічнай інфармацыі. Суадносіны інфармацыйных, дакументных і бібліяграфічных патрэбнасцей. Класіфікацыя інфармацыйных патрэбнасцей па формах існавання, у залежнасці ад носьбітаў інфармацыйных патрэбнасцей, спажыўцоў інфармацыі, іх праяўлення. Найбольш значныя прыметы, па якіх можна ахарактарызаваць патрэбнасці ў інфармацыі.

Выдзяленне асноўных груп спажыўцоў інфармацыі – аснова якаснага дыферэнцыраванага бібліяграфічнага абслугоўвання. Розныя падыходы да класіфікацыі спажыўцоў інфармацыі, чытачоў, распрацаваныя ў бібліятэказнаўстве і бібліографазнаўстве. Асаблівасці складу спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыі ў бібліятэках розных тыпаў.

### *Тэма 13. Метады вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей*

Прафесійная (непрафесійная) дзейнасць, інфармацыйна-пошукавая дзейнасць і яе вынікі як аб'екты вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей.

Сацыялагічныя метады апытання – найбольш распаўсюджаныя метады вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей. Назіранне як метад збору даных аб інфармацыйных патрэбнасцях. Метады аналізу дакументацыі (бібліятэчнай, прафесійна-вытворчай, нарматыўнай). Выкарыстанне ў дзейнасці бібліятэк і органаў НТІ метадаў экспертных ацэнак, сінтэзавання сітуацый. Фактары, якія ўплываюць на выбар метадаў даследавання інфармацыйных патрэбнасцей. Маніторынг як неабходная ўмова атрымання аператыўнай, аб'ектыўнай і дынамічнай інфармацыі аб інфармацыйных патрэбнасцях: арганізацыя і тэхналогія правядзення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел VI. Арганізацыя, тэхналогія і методыка бібліяграфічнага абслугоўвання

*Тэма 14. Задачы і змест бібліяграфічнага абслугоўвання*

Бібліяграфічнае абслугоўванне: азначэнне паняцця. Віды бібліяграфічнага абслугоўвання. Задачы, характар, змест і арганізацыя бібліяграфічнага абслугоўвання ў бібліятэках розных тыпаў.

*Тэма 15. Бібліяграфічнае інфармаванне: арганізацыя і тэхналогія*

Віды бібліяграфічнага інфармавання. Масавае бібліяграфічнае інфармаванне: азначэнне і сутнасць, яго асноўныя формы. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі бюлетэняў (спісаў) новых паступленняў у бібліятэкі, прадстаўлення бюлетэняў на сайтах бібліятэк; выстаў (традыцыйных і электронных); бібліяграфічных аглядаў літаратуры; «Дзён інфармацыі». Выкарыстанне СМІ, Інтэрнэту для інфармавання аб новых пастудленнях.

Дыферэнцыраванае бібліяграфічнае інфармаванне: спецыфіка, тэхналогія. Асноўныя формы індывідуальнага бібліяграфічнага інфармавання. Сістэма выбарчага распаўсюджвання інфармацыі (ВРІ): патрабаванні і прынцыпы яго функцыянавання. Дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўнікоў (ДАК) як падсістэма ВРІ і яго спецыфіка. Аўтаматызаваная сістэма ВРІ як падсістэма інтэгральнай аўтаматызаванай бібліятэчна-інфармацыйнай сістэмы. Характарыстыка асноўных тэхналагічных працэсаў, ажыццяўляемых з выкарыстаннем аўтаматызаваных сродкаў. Асноўныя формы групавога бібліяграфічнага інфармавання: тэматычныя спісы (бюлетэні) новых пастудленняў, колавая пошта як формы інфармавання калектыўных абанентаў, «Дзень спецыяліста».

*Тэма 16. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне: арганізацыя і тэхналогія*

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне: азначэнне, асноўныя элементы. Разавы запыт, яго віды. Адказ на запыт, яго віды. Віды даведкі, сутнасць метадычнай кансультацыі, віды і прычыны адмоў. Пераадрасаванне запыту. Пошук, бібліяграфічны і фактаграфічны, як элемент даведачна-бібліяграфічнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абслугоўвання. Фактары, якія ўплываюць на якасць даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання.

Тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання: прыём запыту; устанаўленне кола крыніц, неабходных для аптымальнага задавальнення запыту; пошук бібліяграфічнай, фактаграфічнай інфармацыі; афармленне даведкі; рэгістрацыя даведкі ў журнале ўліку; выдача ці накіраванне яе абаненту.

Асаблівасці выканання розных тыпаў даведак: тэматычных, удакладняючых, адрасна-бібліяграфічных даведак; фактаграфічных даведак. Асаблівасці аўтаматызаванай тэхналогіі даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання на этапе падрыхтоўкі пошукавага прадпісання; рэалізацыі асноўных тыпаў бібліяграфічнага пошуку. Асаблівасці даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання з выкарыстаннем універсальных пошукавых сістэм Інтэрнэту. Фарміраванне пошукавага прадпісання. Уяўленне аб пошукавым інтэрфейсе пошукавай сістэмы. Віды пошукавага інтэрфейсу: просты і пашыраны пошук. Структура прадстаўлення запісу аб html-дакументах. Уяўленне аб ранжыраванні дакументаў пры выдачы вынікаў пошуку. Выкарыстанне функцыі зваротнай сувязі для павышэння дакладнасці пошуку. Віртуальная служба даведачна-бібліяграфічнага абслугования: тэхналогія выканання запытаў карыстальнікаў у электроннном асяроддзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел VII. Фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі

### *Тэма 17. Фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі: агульныя пытанні*

Бібліяграфічная культура як састаўная частка інфармацыйнай культуры. Змест і азначэнне паняццяў «бібліяграфічная культура» і «інфармацыйная культура». Сістэма фарміравання бібліяграфічнай культуры асобы ў краіне. Роля і задачы бібліятэк у фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Арганізацыйныя аспекты работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Асноўныя прынцыпы, метадычныя патрабаванні да арганізацыі і зместу работы бібліятэк у гэтым кірунку. Вывучэнне эфектыўнасці работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

*Тэма 18. Формы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі*

Асноўныя напрамкі работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі: у працэсе арганізаванага навучання ў вучэбных установах; у працэсе фарміравання інфармацыйнага асяроддзя ў бібліятэцы; у працэсе спецыяльна праводзімых мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Класіфікацыя форм фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі па розных прыкметах: у залежнасці ад масавасці аўдыторыі; месца правядзення; спосабаў перадачы і фарміравання бібліяграфічных ведаў, уменняў і навыкаў.

Мэтавая накіраванасць выкарыстання, метадычныя асаблівасці арганізацыі і правядзення масавых і дыферэнцыраваных форм фарміравання бібліяграфічнай культуры. Арганізацыя, змест, праграмнае і метадычнае забеспячэнне, выкарыстоўваемыя формы работы бібліятэк розных тыпаў па фарміраванні бібліяграфічнай культуры школьнікаў, студэнтаў, спецыялістаў.

## Раздзел VIII. Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі

*Тэма 19. Агульныя пытанні кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю*

Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю як частка сістэмы кіравання бібліятэкай: азначэнне і сутнасць. Суб’екты і аб’екты кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю ў бібліятэцы. Дыферэнцыяцыя суб’ектаў кіравання ў залежнасці ад узроўню займаемай пасады: іх функцыі, абавязкі і паўнамоцтвы. Загадчык бібліяграфічнага аддзела бібліятэкі, яго роля ў рэалізацыі функцый кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю. Бібліяграфічная служба бібліятэкі – спецыфічны аб’ект кіравання.

Асаблівасці кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю ў бібліятэках розных тыпаў. Арганізацыйная структура кіравання бібліяграфічнай дзейнасцю, яе залежнасць ад тыпу, арганізацыйнай структуры бібліятэкі. Прынцыпы, метады кіравання. Функцыі кіравання (планаванне, арганізацыя, улік, кантроль, рэгуляванне): іх характарыстыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 20. Планаванне, улік і справаздача аб бібліяграфічнай рабоце*

Планаванне як функцыя кіравання: азначэнне, значэнне. Задачы, прынцыпы, метады планавання. Віды планаў. Адлюстраванне бібліяграфічнай работы ў гадавым плане бібліятэкі. Тэхналогія падрыхтоўкі гадавога плана бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэкі. Структура плана. Асноўныя напрамкі бібліяграфічнай работы і іх адлюстраванне ў плане. Методыка разліку асноўных паказчыкаў і працаёмкасці па асобных працэсах і відах бібліяграфічнай работы.

Улік бібліяграфічнай работы: значэнне і задачы. Віды ўліку, аб’екты і адзінкі ўліку, формы ўліку розных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці. Патрабаванні да ўліку бібліяграфічнай работы. Асаблівасці аўтаматызаванай тэхналогіі ўліку бібліяграфічнай работы. Структура і змест квартальнай і гадавой справаздачы бібліяграфічнага падраздзялення бібліятэкі. Адлюстраванне бібліяграфічнай работы ў справаздачах небібліяграфічных падраздзяленняў. Аналіз паказчыкаў справаздачы і адзнака выканання плана бібліяграфічнай работы.

### *Тэма 21. Метадычнае забеспячэнне бібліяграфічнай дзейнасці*

Паняцце метадычнай дапамогі ў бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк на сучасным этапе, яе змест і асаблівасці. Бібліяграфічны аддзел – цэнтр метадычнай дапамогі па бібліяграфічнай рабоце. Асноўныя кірункі метадычнага забеспячэння бібліяграфічнай дзейнасці: аналітычная; методыка-кансультацыйная работа; высвятленне, вывучэнне і распаўсюджванне інавацыйных метадаў працы, новых тэхналогій; павышэнне бібліяграфічнай кваліфікацыі бібліятэчных кадраў. Выкарыстанне аўтаматызаваных тэхналогій і рэсурсаў сусветных камп’ютарных сетак у розных кірунках метадычнай работы бібліяграфічнага аддзела.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Абросимова, Н. В.* Библиографическая деятельность библиотеки: учеб.- практ. пособие / Н. В. Абросимова. – СПб. : Профессия, 2013. – 160 с.

2. *Березкина, Н. Ю.* Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси / Н. Ю. Березкина, Л. А. Авгуль, Б. Б. Невский. – Минск : Красико-Принт, 2002. – 144 с.

3. *Блюменау, Д. И.* Информационный анализ/синтез для формирования вторичного потока документов: учеб.-практ. пособие / Д. И. Блюменау. – СПб. : Профессия, 2002. – 240 с. – (Серия «Специалист»).

4. *Брежнева, В. В.* Информационное обслуживание: учеб. пособие / В. В. Брежнева, Р. С. Гиляревский. – СПб. : Профессия, 2012. – 365, [2] с.

5. *Брежнева, В. В.* Информационное обслуживание: продукты и услуги, предоставляемые библиотеками и службами информации предприятий / В. В. Брежнева, В. А. Минкина. – СПб. : Профессия, 2004. – 304 с.

6. *Галеева, И. С.* Путеводитель библиографа по Интернету : учеб.-практ. пособие / И. С. Галеева. – СПб. : Профессия, 2013. – 240 с. – (Библиотека).

7. *Гордукалова, Г. Ф.* Технологии анализа и синтеза профессиональной информации / Г. Ф. Гордукалова. – СПб. : Профессия, 2015. – 544 с.

8. *Жабко, Е. Д.* Справочно-библиографическое обслуживание в электронной среде: теория и практика / Е. Д. Жабко ; РНБ. – СПб. : РНБ, 2006. – 387 с.

9. *Захарчук, Т. В.* Аналитико-синтетическая переработка информации: учеб.-практ. пособие / Т. В. Захарчук, И. П. Кузнецова. – СПб. : Профессия, 2011. – 103 с.

10. *Зыгмантовіч, С. В.* Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці : вучэб. дапам. / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – 325 с.

11. *Зыгмантовіч, С. В.* Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі : вучэб. дапам. / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 123 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Коготков, Д. Я.* Библиографическая деятельность библиотеки: организация, управление, технология : учебник / Д. Я. Коготков. – СПб. : Профессия, 2004. – 304 с.

*13. Колкова, Н. И.* Технологии создания электронных информационных ресурсов : учеб. пособие / Н. И. Колкова, И. Л. Скипор. – М. : Литера, 2013. – С. 104–244.

*14.* Концепция информационного взаимодействия библиотек Беларуси: разработана в рамках Программы развития единой компьютерной сети Республики Беларусь (НИКС РБ) и утверждена на засед. респ. библиотечного совета при М-ве культуры 3.03.2000 г. / Белорус. библиотеч. ассоциация. – Минск : Красико-Принт, 2001. – 47 с.

*15. Панкова, Е. В.* Электронное библиографическое пособие: практ. руководство для библиотечных работников / Е. В. Панкова, Л. С. Беркутова. – М. : Форум, 2013. – 132 с.

*16. Пилко, И. С.* Информационные и библиотечные технологии : учеб. пособие / И. С. Пилко. – СПб. : Профессия, 2006. – 341 с.

*17.* Справочник библиографа / науч. ред. Г. Ф. Гордукалова, В. А. Минкина. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2014. – 768 с. – (Серия «Библиотека»).

*18.* Справочник библиотекаря / науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – Изд. 2-е, испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2001. – 439 с. – (Серия «Библиотека»).

*19.* Справочно-поисковый аппарат: учеб. пособие / под ред. И. С. Пилко. – СПб. : Профессия, 2015. – 288 с.

*20. Степанов, В. К.* Применение Интернета в профессиональной информационной деятельности / В. К. Степанов. – М. : ФАИР, 2009. – 304 с.

*Дадатковая*

*21. Андреева, Н. Е.* Виртуальные справочные службы в библиотеках: тенденции развития / Н. Е. Андреева // Библиография. – 2012. – № 2. – С. 47–49.

*22. Антонова, Н. С.* Тематические обзоры интернет-ресурсов и электронные версии информационных пособий как новая форма библиографической деятельности / Н. С. Антонова, Е. В. Ярошенко // Румянцевские чтения: материалы Междунар. конф., 5–7 апр. 2005 г. – М. : Пашков дом, 2005. – С. 8–10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

23. *Бавин, С. П.* Рекомендательная библиография : состояние и перспективы / С. П. Бавин // Труды Междунар. библиограф. конгресса, Санкт-Петербург, 21–23 сент. 2010 г. – СПБ. : Рос. нац. б-ка, 2012. – Ч. I. – С. 447–454.

24. *Гендина, Н. И.* Информационная культура личности: диагностика, технология формирования: учеб. пособие / Н. И. Гендина, Н. И. Колкова, И. Л. Скипор. – Кемерово : Кемер. гос. акад. культуры и искусств, 1999. – Ч. 1. – 146 с.

25. *Городко, И. П.* Методологические аспекты формирования аналитического состава отраслевых библиографических баз данных Центральной научной библиотеки им. Я. Коласа Национальной академии наук Беларуси / И. П. Городко, И. А. Голованева // Бібліятэчны весн. : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2012. – Вып. 4. – С. 120–127.

26. *Зарайская, В. П.* Традиционная научно-вспомогательная библиография в новых условиях обеспечения доступности информации / В. П. Зарайская // Методологические и теоретические проблемы библиографии в контексте новых информационных технологий : сб. ст. / Рос. гос. б-ка, НИО библиографии. – М. : Пашков дом, 2007. – С. 90–102. – (Вопросы библиографоведения; вып. 16).

27. *Зыгмантович, С. В.* Подготовка библиографической продукции библиотеками: науч.-практ. пособие / С. В. Зыгмантович. – Минск : Новое знание, 2009. – 229 с.

28. *Елисина, Е. Ю.* Электронные услуги библиотек / Е. Ю. Елисина. – СПб. : Профессия, 2010. – 302, [1] с. – (Библиотека).

29. Інфармацыйныя рэсурсы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі : зб. арт. / склад. Т. Кузьмініч. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 2008. – 202 с.

30. *Кряжева, М. Ф.* Информационное взаимодействие в библиотечной среде : учеб.-метод. пособие / М. Ф. Кряжева. – М. : Литера, 2013. – 91 с. – (Серия «Современная библиотека»).

31. *Кузьминич, Т. В.* Национальная библиотека Беларуси как центр библиографической деятельности: современное состояние / Т. В. Кузьминич // Библиотековедение. – 2011. – № 2. – С. 91–96.

32. *Кузьмініч, Т. В.* Бібліятэчны сегмент нацыянальных фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў: тэарэтыка-метадычны аспект / Т. В. Кузьмініч // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2010. – № 2 (14). – С. 87–97.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*33.* Поручи поиск человеку : виртуал. справ. службы в совр. б-ках / И. Б. Михнова, А. А. Пурник, А. В. Пурник, М. М. Самохина ; под общ. ред. И. Б. Михновой. – М. : ФАИР-ПРЕСС, 2005. – 304 с.

*34.* Разработка и внедрение виртуальных сервисов / Нац. б-ка Беларуси ; авт.-сост.: Е. Е. Долгополова [и др.]. – Минск : [б. и.], 2010. – 64 с.

*35.* Рекомендательная библиография и библиотечная практика : сб. ст. / Рос. гос. б-ка, НИО библиографии. – М. : Пашков дом, 2007. – 168 с.

*36. Савкина, С. В.* Электронные книжные выставки: потребительские свойства, технология подготовки / С. В. Савкина // Библ. технологии. – 2009. – № 1. – С. 24–29.

*37. Савкина, С. В.* Электронная книжная выставка как библиографический продукт / С. В. Савкина // Библиосфера. – 2011. – № 2. – С. 97–100.

*38. Теплицкая, А. В.* Библиографическая продукция национальных библиотек – членов БАЕ: сравнительный анализ / А. В. Теплицкая, Л. В. Жукова // Библиография. – 2009. – № 6. – С. 19–33.

*39. Трачук, Л. Ф.* Классификация электронной библиографической продукции / Л. Ф. Трачук, Г. Н. Швецова-Водка // Науч. и техн. б-ки. – 2009. – № 8. – С. 33–46.

*40. Яковлева, Н. А.* Мониторинг создания библиографической продукции / Н. А. Яковлева // Библиография. – 2007. – № 2. – С. 61–67.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Асноўнымі сродкамі дыягностыкі засваення ведаў і авалодвання неабходнымі ведамі і ўменнямі па дысцыпліне з’яўляецца рубежны кантроль ведаў, праверка заданняў разнастайнага тыпу, якія выконваюцца ў рамках гадзін, адведзеных на лекцыі (франтальнае апытанне на лекцыях, тэставы кантроль), семінарскія заняткі (вуснае апытанне, круглы стол, электронныя прэзентацыі), практычныя заняткі (праверка індывідуальных заданняў, творчых заданняў), СРС (рэфераты, эсэ).

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

У мэтах павышэння эфектыўнасці засваення вучэбнага матэрыялу па дысцыпліне і фарміравання прафесійных кампетэнцый прадугледжана самастойная работа студэнтаў (СРС), якая накіравана на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў; фарміраванне ў іх уменняў і навыкаў самастойнага набыцця і абагульнення ведаў; фарміраванне ўменняў і навыкаў самастойнага прымянення ведаў на практыцы; самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Студэнты вывучаюць рэкамендаваную літаратуру і выконваюць розныя формы СРС па прапанаваных тэмах. Змест работы павінен паказаць ступень засваення студэнтамі асноўных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці, валодання навыкамі і ўменнямі рыхтаваць разнастайныя бібліяграфічныя прадукты і паслугі, фарміраваць і выкарыстоўваць бібліяграфічныя рэсурсы як лакальныя, так і аддаленыя.

## Формы выканання самастойнай работы:

– самастойнае вывучэнне асобных тэм курса і падрыхтоўка да гутаркі;

– напісанне рэферата (не менш 12 старонак);

– распрацоўка візуальнай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў);

– падрыхтоўка і прэзентацыя бібліяграфічных прадуктаў і паслуг (бібліяграфічных дапаможнікаў, навігатараў па сеткавых рэсурсах і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Прыкладная тэматыка семінарскіх заняткаў

1. Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці Беларусі.
2. Арганізацыя бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы.
3. Спажыўцы бібліяграфічнай інфармацыі і метады вывучэння іх інфармацыйных патрэбнасцей.
4. Бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк у новых інфармацыйна-тэхналагічных умовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ**
**Раздзел 1. АРГАНІЗАЦЫЯ І ТЭХНАЛОГІЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РАБОТЫ**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,51. Ул.-выд. арк. 1,06. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ